молодёжи. Организованный досуг способствует их самореализации, развитию различного рода социальной активности, самовыражению и саморазвитию.

Сфера досуговой деятельности содействует улучшению межличностного общения, предоставляет возможность для проявления социально значимых качеств, что так необходимо в современном мире, в мире информационных технологии, где молодежь находится в потоке общения посредством социальных сетей, Интернет–форумов, блогов, электронной почты и т.д.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Аванесова, Г.А. Культурно-досуговая деятельность: теория и практика организации : учебное пособие для студентов вузов / Г.А. Аванесова. – Москва: Аспект Пресс, 2006. – С.235.

2. Вдовенко, Т.В. Управленческое консультирование / Т.В. Вдовенко, Г.М. Цинченко // научная статья «Сфера досуга в странах Западной Европы». – 2015. – №6. – С.144.

3. Карасёва, Н.В. Организация работы с молодёжью: учеб.-метод. пособие / Н.В. Карасёва, А.А. Сухарь. – Москва: Директ-Медиа, 2015. – С.2–200.

Чудук М. М., магистрант
Научный руководитель – Кривошеева С. В.,
кандидат искусствоведения, доцент кафедры

**ЖЭК-АРТ ЯК З’ЯВА АМАТАРСКАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ РАСІІ І БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX- ПАЧАТКУ XXI ст.**

Аматарскае мастацтва развіваецца паралельна з прафесійным мастацтвам і выклікае не меншую цікавасць да яго вывучэння. Сучасная аматарская творчасць мае разнастайныя формы, напрыклад, як частка вулічнага мастацтва. Сучасныя жыхары горада адчуваюць патрэбу ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу, якi адасоблены ад прафесійнай цікавасці і выяўляецца ў аб'ектах так званага ЖЭК-арта.

ЖЭК-арт вывучалі сучасныя даследнікі, мастацтвазнаўцы і ўрбаністы з розных пунктаў гледжання. Напрыклад, даследаванне «Жилищно-коммунальное искусство» на чале з мастацтвазнаўцам і мастаком Антонам Польскім (Мэйком) у 2017 годзе. Таксама, у 2019 годзе была выдадзена кніга-даследаванне дызайнера Паліны Сакаловай «Как воспринимать ЖКХ-арт?».

Грунтуючыся на прароблених даследаваннях, можна сфармуляваць вызначэнне ЖЭК-арта — гэта творчае ўладкаванне гарадской прасторы і прыдамавых тэрыторый. Гэта, як і ўпарадкаванасць простымі гараджанамі, так і наіўная «творчасць» працаўнікоў ЖЭКаў. Узнікненне тэрміна звязвна з аднайменным паблікам УКантакце, які адкрыўся ў 2014 годзе. Правільней было б назваць гэтую з'яву туж-артам (руск. ТСЖ-арт) ад «таварыства ўласнікаў жытла», але тэрмін ЖЭК-арт (ці ЖКГ-арт (руск. ЖКХ-арт)) апынуўся больш мілагучным, ён і замацаваўся [5, с. 10].

ЖЭК-арт можна разглядаць як сацыякультурную з'яву і як частку мастацкай культуры.

Як сацыякультурная з'ява – гэта творчая дзейнасць людзей, скіраваная на фармаванні аблічча прыдамавой тэрыторыі, вулічнай прасторы і «твара» горада ў цэлым. Навакольная прастора напаўняецца асабістымі сэнсамі, людзі робяць свой унёсак ва ўладкаванне вонкавага аблічча горада, і чалавек, з'яўляючыся творцам, не толькі дэманструе свой творчы патэнцыял, але і стварае маркеры для самаідэнтыфікацыі з тэрыторыяй жыцця [1, с. 73].

З пункту гледжання мастацкай культуры, ЖЭК-арт – гэта праява выяўленчага прымітыву і наіўнага мастацтва. Гэты кірунак непрафесійнага мастацтва, аўтаномная мастацкая з'ява з унікальнай выяўленчай мовай, якая валодае пазачасавым характарам і здольнасцю знаходзіць сабе месца ў культуры розных сацыяльных груп.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі казаць пра месца ЖЭК-арта ў сістэме мастацтваў, то некаторыя даследнікі лічаць яго часткай стрыт-арта, праявай гарадскога мастацтва, але, пры гэтым, як самастойнага кірунка сучаснай творчасці, які ствараецца на грунце індывідуальных пераваг жыхароў пэўнай хаты ці гарадскога двара. Але адначасна стрыт-арт і ЖЭК-арт можна інтэрпрэтаваць як дзве процілегласці. На падставе таго, што аўтары твораў стрыт-арта – гэта моладзь, што асвойвае першым чынам фарбу, мел, драпіны; а мастакі ЖЭК-арта – пажылыя людзі, якія звыкліся нешта рабіць рукамі ці людзі, чыя асноўная дзейнасць не злучана з творчасцю і для каго стварэнне падобных аб'ектаў з'яўляецца хобі і творчай аддухай. Адгэтуль галоўны кірунак: дэкор і малая архітэктурная форма. І ў гэтым аспекце ЖЭК-арт робіцца бліжэй да народнага мастацтва.

Такім чынам, ЖЭК-арт з'яўляецца кірункам сучаснага народнага вулічнага мастацтва.

ЖЭК-арт узнік у савецкі перыяд і быў звязаны з радыкальнай урбаністычнай трансфармацыяй гарадоў [2]. Пасля перыяду аднаўлення пасля другой сусветнай вайны, СССР сутыкнуўся праблемай жытла. У 60-ых гадах па праграме Н. Хрушчова была пабудавана вялікая колькасць хуткага і даступнага жытла па ўсёй тэрыторыі СССР. Амаль адразу ў жыхароў з'ўлялася жаданне прыўнесці яркія фарбы ў навакольнае асяроддзе і ўпрыгожыць шэрую прастору вакол. І гэта традыцыя афармлення прыдамавых тэрыторый дажыла да нашых дзён. Таму ЖЭК-арт сустракаецца паўсюдна ў постсавецкіх краінах. Найболей даследавана і апісана праява ЖЭК-арта ў Расіі, сабрана велізарная колькасць візуальнага матэрыялу, інфармацыі пра аўтараў твораў. Напрыклад, П. Сакалова адкрыла імёны такіх мастакоў-аматараў як Марыя Шышкіна, Марыя Пашнева, Маргарыта Траўкіна і Уладзімір Батуков [5, с. 34].

У Беларусі ЖЭК-арт таксама мае праяву, але пакуль малавывучаны. З найболей яркіх прыкладаў можна назваць падворак дома нумар 30 на вуліцы Сядых горада Мінска. На тэрыторыі двара змешчана велізарная колькасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скульптур у выглядзе жывёл, як мясцовых, так і экзатычных. Матэрыял разнастайны – дрэва, пластык, але, пераважна – пенапласт. Аўтарам скульптур з'яўляецца Анатоль Ждан, сантэхнік па прафесіі [3].

Яшчэ адзін запамінальны прыклад ЖЭК-арта можна сустрэць па дарозе Мінск – Віцебск, у комплексе «Гостинный двор», які размяшчаецца ва ўрочышчы Усохі Лепельскага раёна. Сярод скульптур, выкананых з бетону, можна сустрэць такіх персанажаў як коніка-гульца на скрыпцы, трох волатаў, ваўка на рэтра-аўтамабілі з зайцам на матацыкле, і нават індыйскага слана. Аўтар – Ігар Трыбо, настаўнік працоўнага навучання мясцовай гімназіі [4].

Скульптуры Юрыя Сцяпанавіча з вёскі Шаловічы Слуцкага раёна таксама можна лічыць праявай ЖЭК-арта. На тэрыторыі яго падворка ў велізарнай колькасці змешчаны скульптуры райскіх птушак з пластыкавых бутэлек, лебедзяў з покрывак і іншых экзатычных і мясцовых звяроў. Юры Сцяпанавіч таксама распісаў сцены практычна ўсіх пабудоў двара рознымі сюжэтнымі кампазіцыямі: ад кветкавых букетаў да казачнага марскога царства.

Такім чынам, ЖЭК-арт – гэта з’ява як сацыякультурная, так і мастацкая. Гэта яркі прыклад новага наіўнага мастацтва, які яшчэ і з'яўляецца адметнай рысай адзінства постсавецкай прасторы. Калі разглядаць ЖЭК-арт як кірунак у аматарскім мастацтве, то, нягледзячы на прароблены даследванні ў гэтай галіне, ён усе яшчэ мае патрэбу ў тэрміналагічным, каштоўнасным і мастацкім асэнсаванні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Жарков, А. Д. ЖЭК-арт: от индивидуальной печати до глобальной коммуналки / А. Д. Жарков // Визуальные образы современной культуры. Изучая локальность: фундаменальные схемы и исследовательские практики : сб. науч. статей по материалам VII Всероссийской научно-практической конференции, Омск, 27–28 сен. 2018 г. / Омский гос. ун-т

им. Ф. М. Достоевского ; редкол.: П. Л. Зайцев [и др.]. – Омск, 2018. – С. 73–75.

2. Жилищно-коммунальное искусство // Институт исследования стрит-арта [Электронный ресурс]. – 2018. – Режим доступа : http://streetartinstitute.com/communal-art/. – Дата доступа : 16.03.2021.

3. Необычные дворики Минска: от поселения мамонтов до летающих собак // Агенство Минск-новости [Электронный ресурс]. – 2018. – Режим доступа : https://minsknews.by/neobyichnyie-dvoriki-minska-ot-poseleniya-mamontov-do-letayushhih-sobak/. – Дата доступа : 10.03.2021.

4. Послушать кунечика, покататься на ретро-авто, залезть на слона и вытянуть репку // Витебский курьер [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа : https://vkurier.by/80664. – Дата доступа : 28.02.2021.

5. Соколова, П. М. Как воспринимать ЖКХ-арт / П. М. Соколова. – Москва : Школа дизайна НИУ ВШЭ, 2019. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шаболда К. О., студент 101а группы
Научный руководитель – Бриткевич Д. В.,
кандидат искусствоведения, доцент кафедры

## ТВОРЧЕСТВО САЛЬВАДОРА ДАЛИ КАК САМОБРЕНДИНГ

11 мая 1904 года в небольшом испанском городке Фигерасе в Испании, в зажиточной семье дона Сальвадора Дали-и-Куси и доньи Фелипы Доменеч, родился мальчик, которому было предрешено стать эпохальным гением. Звали его Сальвадор Дали.

Дали был одним из самых скандальных художников прошлого века. Его закрученные вверх усы были знакомы даже тем людям, которых никогда не интересовало высокое искусство. Книги о нём расходились огромными тиражами, на его выставки выстраивались длинные очереди, а во время проведения опроса, организованного в 1995 году лондонской